# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

## Звесткі з архіва
## Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з’яўляецца юбілейным.*

# 90 гадоў

**Куляшоў, А. Па песьню, па сонца… : (Першая кніга поэзіі) / Аркадзь Куляшоў. – Менск [Мінск] : ДВБ, ЛіМ, 1932. – 86 с.**




**Куляшоў, А. Медзі дождж : Эпос / Аркадзь Куляшоў. – Менск [Мінск] : ДВБ, ЛіМ, 1932. – 68 с.**



# 90 гадоў



Важным этапам у жыцці Аркадзя Куляшова (1914–1978) з’яўляецца вучоба на літаратурным факультэце Мінскага педінстытута (1931–1933). У гэты перыяд будучы народны паэт Беларусі шмат пісаў аб тагачасных зменах у краіне. Вынікам напружанай працы стаўся выхад у 1932 годзе двух паэтычных зборнікаў – «Па песню, па сонца!..», тыражом у 3000 экзэмпляраў, і «Медзі дождж», тыраж якога – 2000 экзэмпляраў. Гэта другі і трэці зборнікі паэта.

# 90 гадоў

Першы зборнік вершаў Аркадзя Куляшова – «Росквіт зямлі» – выйшаў у 1930 годзе (аўтару было толькі 16 гадоў). Рэдактарам той кнігі быў Міхась Чарот. Ён вельмі моцна «пачысціў» зборнік, а малады аўтар вельмі ўзрушыўся ад такога самавольства.
На наступным сваім зборніку «Па песню, па сонца!..» Аркадзь Куляшоў напісаў – «Першая кніга паэзіі». Хоць па факце яна была другой.



# 90 гадоў

У зборнік «Па песню, па сонца!..» увайшлі 23 паэтычныя творы, размеркаваныя па чатырох раздзелах: «Маім аднагодкам», «А вясне», «Мае прыгоды», «Лёс». Нягледзячы на тэматычны падзел, усе творы так ці інакш адлюстроўваюць імклівы тагачасны рытм жыцця, захопленасць юнацкімі рамантычнымі пачуццямі і шчырую веру ў сонечнае заўтра.


ЗЬМЕСТ


Стар
Па песьню, па сонца!— . . . . . . 3
Дарогі . . . . . . . 8

Маім аднагодкам

Агульная гісторыя ніzкі . . . . . 19
Гісторыя гэтай ніzкі . . . . . 21
На лесавагатоўках . . . . . 24
Распрацоўкі . . . . . . 28
Пра сябе . . . . . . 30

А вясьне

А вясьне . . . . . . . 35
На вямлі . . . . . . . 37
Пяцігодка . . . . . . . 40
Будуем вялікія дні . . . . . . 42
Цьвік . . . . . . . 44
На палёх . . . . . . . 47
Малацьба . . . . . . . 49

Мае прыгоды

Надзвычайнае сяброўства . . . . . 53
Расьцьвілі сады . . . . . . 56
Астраном . . . . . . . 57
За зоры, за месік, за ветравы сьмех... . . . 60

Лёс

Бацькі . . . . . . . 65
Сібір . . . . . . . 69
Узбэкскія мотывы . . . . . . 71
Пагромы . . . . . . . 73
Доля цяжкая чалавек . . . . . 79

# 90 гадоў

Зборнік «Медзі дождж» складаюць два раздзелы. Першы раздзел «Сонечнае заўтра» ўключае вершы, а ў другім раздзеле «Крыўда» змешчаны першая і другая часткі аднайменнай паэмы.



ag 8/45705
БССР ... № 6306

ЗЬМЕСТ

Стар.

СОНЕЧНАЕ ЗАЎТРА

Балота . . . . . . . 7
Першая стрэча з трактарстам Анісам . . . . . . . 10
Каля сіласарэзкі . . . . . . . 13
Таварыш Алесь . . . . . . . 16
„Першабытны чалавек" . . . . . . . 19
Я прымацоўваюся да трактара . . . . . . . 22
На ўборцы сена . . . . . . . 25
На лузе ўначы . . . . . . . 28
Сустракайце маладымі песьнямі! . . . . . . . 31

КРЫЎДА

На Імпэрыялістычнай вайне (частка першая) . . . . . . . 37
Дзесяць (частка другая) . . . . . . . 51

Рэдактар А. Кучынскі
Тэхрэдактар Х. Абрамава
Корэктар А. Перская
Вокладка мастака Б. Малкіна
Здана ў друкарню 20-III—32 г.
Падпісана да друку 21-V—32 г.

Галоўлітбел № 162
«Палесдрук», Гомель
Заказ № 1105
Тыраж 2000 экз. (1/4 арк.)

*Памяці дарагога таварыша*
*МІКОЛЫ БАРДОНА*

„...Усе мы
Сонечнае Заўтра
песьцілі,
А яно сягоньня
скалатнула
вёску й горад...
Сустракайце-ж маладымі песьнямі,
Любіце яго так, як любілі ўчора!.."

# 90 гадоў

«У зборніках «Медзі дождж» і «Па песню, па сонца!..» (абодва выдадзены ў 1932 годзе) поўнасцю праявілася авангардна-рэвалюцыйная плынь. Вершы ў большасці сваёй страчваюць музычнасць і напеўнасць, рытм становіцца больш жорсткім, у пэўнай ступені напорыстым. Несумненна, тут адбілася і амаль прымусовае засвойванне традыцыі Маякоўскага, на дзяржаўным узроўні прызнанага найвялікшым савецкім паэтам. Але запозненая арыентацыя на аснове футурызму мела таксама свае станоўчыя вынікі, выпрацоўвала пругкасць паэтычнага радка».

Яраслаў Клімуць

# 90 гадоў

Прачытаць творы Аркадзя Куляшова, у тым ліку і са зборнікаў «Медзі дождж» і «Па песню, па сонца!..», можна на сайце віртуальнага музея паэта «Сэрца, дзе ўсёй зямлі трывога» (https://library-mogilev.wixsite.com/kuleshov/poem-cycles), створанага аддзелам маркетынгу Магілёўскай абласной бібліятэкі.